ГУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»
аддзел па абслугаванню дзіцячага
чытача цэнтральнай бібліятэкі

# Літаратурны календар

## 2023 год

Бяследна нішто не міне,
Гісторыя слова адродзіць.
Ты — мост,
па якім да мяне
Мінуўшчына ў госці прыходзіць.
Мільгаюць старонкі твае —
І мы размаўляем з вякамі,
І продак да нас дастае
Радкамі, нібыта рукамі.
Учора і сёння —
Штодня —
У люты мароз і ў адлігу
Стварае людская радня
Жыцця непаўторную кнігу.

Мы пішам адменным пяром,
Што ўручана родным народам.
Пілот у нябёсах —
крылом,
Араты на полі —
нарогам.
Мы — словы такога пісьма,
Якое ў вяках не сатрэцца.
Ты — мост,
па якім нездарма
Іду я з патомкам сустрэцца.

*П. Макаль*

# 1160

**гадоў з часу стварэння (863) асветнікамі Кірылам і Мяфодзіем славянскай азбукі.**



# 500

**гадоў назад (1523) у Кракаве выдадзена паэма Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра».**

У творы падрабязна і дэталёва апісана паляванне на зубра. Грозны і страшны цяпер гэты лясны велікан.

Пачынаецца поўнае драматызму адзінаборства людзей і магутнай жывёлы. Потым аўтар скіроўваецца да праблем чалавечага існавання. Ён са скрухай гаворыць, што слабее ад несупынных войнаў, людской нязгоды «Хрыстовая светлая вера». Асуджае моцных свету гэтага, якія не думаюць пра спакой і мір.

Апошнія старонкі твора — малітва да Дзевы Марыі. М. Гусоўскі просіць Маці Божую, абаронцу слабых і скрыўджаных, каб ворагі «не цягнулі ў ярмо бездапаможны народ», каб князі, каралі зразумелі ўласнае здрадніцтва, каб мір запанаваў на зямлі.



**120**

**гадоў назад (1903) выдадзена трохтомная праца Я.Ф. Карскага «Беларусы».**

Гэта абшырная манаграфічная праца Карскага пра беларускі народ, у якой ён намціў абагульніць усё сабранае і сказанае ім самім, і іншымі ў галіне беларускай мовы, народнага творчаства ў літаратуры. Разам уся манаграфія складаецца з 7-мі вялікіх кніг. Першы том задуманы як агульны, уводны. Другі том адведзены апісанню беларускай мовы. У трэцім нарыс беларускай народнай творчасьці ды гісторыі старай і новай беларускай літаратуры.



# 115

**гадоў з часу выдання (1908) першага зборніка вершаў Янкі Купалы «Жалейка».**

Першы зборнік твораў Янкі Купалы. Змест яго склалі лірычныя вершы і паэма «Адплата кахання», напісаныя ў 1905–1907 гг. Цэласная кніга лірыкі, найперш дум і перажыванняў, якія выказаны ад імя селяніна. Імкнучыся сцвердзіць сябе паэтам народных мас, выразнікам іх дум і пачуццяў, аўтар у шэрагу вершаў нібы даваў тлумачэнне, хто такі паэт Янка Купала, якія ў яго думы, перажыванні, песні, каму ён іх нясе, ахвяруе.



# 110

**гадоў – зборніку Янкі Купалы «Шляхам жыцця» (1913).**

Асноўным лірычным героям кнігі — становіцца рамантычны вобраз песняра-змагара, прарока светлай будучыні народу. Выдатнае мастацкае адкрыццё Купалы — гістарызм «Шляхам жыцця». З усведамлення славы і няславы, граічнай велічы і трагедыйнасці гістарычнага мінулага лірычны герой зборніку вырастаў у фігуру незвычайнага маштабу, якая ўмяшчала ў сабе вялікую сілу аўтарскіх перажыванняў, выказаных па-мастацку раскавана, з бліскучай паэтычнай віртуознасцю.



**110**

**гадоў — зборніку Якуба Коласа «Нёманаў дар» (1913).**

Апавяданням Коласа, як і яго вершам, уласціва цэласнае, нібыта крыху наіўнае бачанне навакольнага свету, яны прасякнуты тымі ж, што і паэзія, матывамі і вобразамі.



# 110

**гадоў з часу выдання (1913) зборніка вершаў Максіма Багдановіча «Вянок».**

У зборніку можна знайсці словы пра мары, спадзяванні паэта, яго інтымныя пачуцці прызнанні ў любові да роднай зямлі, пра адносіны да паэта і паэзіі. Яго цікавяць агульна-чалавечыя пытанні вечнага і часовага, праблемы жыцця і смерці, памяць.



# 100

**гадоў – паэме Якуба Коласа «Новая зямля» (1923).**

Паэма Я. Коласа «Новая зямля» — вяршыня паэтычнага майстэрства песняра. Працаваў над ёй аўтар больш за дванаццаць гадоў: паэма была пачата ў 1910 г., а апошні раздзел — трагічная развязка — напісаны ў 1923 г. За гэты перыяд адбыліся значныя змены ў жыцці грамадства, і таму паглыбляецца творчая задума аўтара: з аповесці аб жыцці адной леснікова сям'і паэма перарастае ў вялікі твор аб жыцці ўсяго беларускага сялянства (яго беззямеллі, збядненні, пошуках кавалка хлеба на панскай службе, яго палітычным абуджэнні і ўсведамленні сваёй чалавечай годнасці). Праблемы зямлі і волі з'яўляюцца галоўнымі ў паэме.



# 95

**гадоў — аповесці**
**Янкі Маўра «Сын вады» (1928).**

У аповесці «Сын вады» Маўр з глыбокай панікнёнасцю заглядае ў псіхалагічны свет маладога дзікуна Манга, паказвае, як у дзікуна з’яўляецца жаданне рассунуць навакольны свет, пазнаць яго. Безліч цяжкасцей на яго шляху. Але Манг усё перамагае, смела дабіваецца пастаўленай мэты. Што ж ён знаходзіць там? У адказе на гэта і заключаецца асноўны драматызм твора.



# 80

**гадоў — паэме Аркадзя Куляшова «Сцяг брыгады» (1943).**

Паэма «Сцяг брыгады», суровая і гераічная, мужная і стрыманая, раскрывае нам велізарны свет духоунага жыцця беларускага народа ў гады вайны. Тут — усё, што прыйшло на Беларусь разам з вайною. Усё, чым жыў беларускі народ, яго працоўны матэрыяльны побыт і ўсе яго духоўныя багацці, звычаі, традыцыі, абрады — у непрымірымай варожасці з фашысцкім нашэсцем.



**75**

**гадоў – зборніку Васіля Віткі «Вавёрчына гора» (1948).**

Казка пра Веру-вавёрачку,
Пра яе гора-горачка,
Пра яе маленькіх дочак,
Пра вавёрчын малаточак,
Пра птушынага пасла —
Даўганосага бусла,
Пра жыццё-быццё лясное
І яшчэ пра тое-сёе.



**60**

**гадоў – казкі Алены Васілевіч «Калінавая рукавічка» (1963).**

Галоўная тэма творчасці Алены Васілевіч — гэта праблемы сям'і, выхаванне дзяцей, маральна-этычныя праблемы сучаснасці. Шмат Алена Васілевіч пісала для дзяцей. Яе казка «Калінавая рукавічка» ўвайшла ў беларускую дзіцячую класіку.



**55**

**гадоў – раману**
**Уладзіміра Караткевіча**
**«Каласы пад сярпом тваім» (1968).**

Раман Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» — гэта твор пра драматычныя падзеі нашай гісторыі, перадумовы паўстання 1863–64 гг. Пісьменнік стварыў яркі вобраз эпохі, якая дала свету і нашай Айчыне сапраўдных герояў, мужных барацьбітаў за волю. Маштабнасць задумы твора бачна ўжо ў назве твора, што мае сімвалічна-алегарычны сэнс.



**Праходзілі вякі, адыходзілі ў нябыт пакаленні,**

**знікалі магутныя дзяржавы, а кніга —**

**вялікае цуда, створанае чалавечым розумам, —**

**жыла, хвалявала сэрцы, абуджала думку.**

***С. Александровіч***

**Дарагія, чытачы!**
**Прыходзьце да нас за кнігамі.**
**Яны вас чакаюць!**

**Мы знаходзімся па адрасу:**
**плошча імя У.І. Леніна, 5**